Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

Орган Часовага Упраўлення гор. Вільно

ВІЛЕНСКАЯ ПРАЎДА

№ 7
29 верасня 1939 г.
пятніца

Рабочую Гвардыю акружым заботай і увагай

Ажыццяўляючы гарачае жаданне народаў Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны, доблесная Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія дапамагла ім вызваліцца ад памешчыцкага гнёта, пазбавіцца ад жахаў імперыялістычнай вайны, стварыла неабходныя ўмовы для спакойнага і шчаслівага жыцця.

Ва ўсіх кутках Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны працоўнае насельніцтва сустракала Чырвоную Армію — сваю вызваліцельніцу, з вялікай радасцю. Насельніцтва выходзіла насустрэч Чырвонай Арміі, нясло ёй сваю любоў і глыбокую ўдзячнасць за створаную магчымасць жыць па-новаму — без паноў і памешчыкаў, без таго ўціску, які вісеў над імі ўсе гэтыя годы.

Прыход Чырвонай Арміі выклікаў вялікую палітычную актыўнасць, падняў ініцыятыву працоўных мас і прабудзіў шырокія масы к актыўнаму жыццю, к актыўнаму ўдзелу ў грамадскай рабоце. Зараз на фабрыках і заводах створаны рабочыя камітэты, якія прыступілі да арганізацыі нармальнай работы. Вылучаны тройкі для аказання практычнай дапамогі Часоваму Упраўленню. У большасці валасцей створаны сялянскія камітэты. Яны прыступілі да раздзелу памешчыцкай зямлі.

Народная актыўнасць выразілася таксама ў стварэнні Рабочай Гвардыі. Сотні лепшых прадстаўнікоў рабочага класа, каму дорагі інтарэсы працоўных, пайшлі ў рады Рабочай Гвардыі, каб прыняць актыўны ўдзел у дзяржаўным будаўніцтве і дапамагчы Часоваму Упраўленню ўстанавіць нармальнае, спакойнае жыццё насельніцтва.

На заводзе «Электрыт», у чыгуначным дэпо г. Вільно і ў шэрагу другіх прадпрыемстваў рабочая гвардыя прыступіла да ахавы грамадскага парадка. Тут вылучаюцца штодзённа караулы, ахоўваюцца масты, завадская маёмасць. Гвардзейцы зорка сочаць за варожымі элементамі, якія ўсяляк імкнуцца пашкодзіць нармальнай рабоце. У горадзе выстаўлены пасты, якія наглядаюць за санітарным парадкам, вядуць рашучую барацьбу з крымінальнымі праступленнямі.

Ужо за першыя дні работы рабочай гвардыі можна канстатаваць наяўнасць рада станоўчых прыкладаў самаадданай работы рабочай гвардыі. Гэта толькі пачатак. Рабочай гвардыі прадстаіць вырашыць і ажыццёвіць рад сур'ёзнейшых задач у інтарэсах забеспячэння спакойнай работы працоўных мас. Вось чаму асноўнай умовай паспяховай работы гвардыі з'яўляецца перш за ўсё высокая, свядомая дысцыпліна. Трэба павысіць пільнасць і сачыць за тым, каб у рады рабочай гвардыі не пранікалі варожыя элементы.

Між тым трэба адзначыць, што асобным элементам удалося прабрацца ў рады Рабочай Гвардыі. Так, у трэці батальён, пралезлі быўшы сержант польскай арміі Сасноўскі і віленскі паліцэйскі Рынкевіч.

Іх зараз-жа разаблачылі і выгналі з рабочай гвардыі. Але гэты факт абавязвае ўсіх нас больш уважліва падыходзіць да падбору людзей на адказныя участкі.

Першачарговай задачай Рабочай Гвардыі з'яўляецца наладжванне ўнутранай работы самой гвардыі, устанаўленне строгага парадка і дысцыпліны. Рабочая Гвардыя з'яўляецца першым памочнікам Чырвонай Арміі. Яна павінна паказаць узоры дысцыплінаванасці і самаадданасці. Працоўныя аказалі гвардыі вялікі давер і гвардзейцы павінны апраўдаць яго з чэсцю.

Акружым-жа асаблівай увагай і заботай Рабочую гвардыю, якая выконвае вялікія задачы, пастаўленыя працоўным народам Заходняй Беларусі.

Аб заключэнні пакта аб узаемадапамозе і гандлёвага пагаднення паміж СССР і Эстонскай Рэспублікай

24—28 верасня ў Маскве вяліся перагаворы паміж Народным Камісарам Замежных Спраў тав. Молатавым і міністрам замежных спраў Эстоніі г. Сельтэрам па пытанню аб заключэнні пакта аб ўзаемадапамозе і гандлёвага пагаднення паміж Савецкім Саюзам і Эстоніяй. У перагаворах удзельнічалі тав. Сталін і Мікаян, а з боку Эстоніі — старшыня дзяржаўнай думы прафэсар Ю. Улуотс, праф. А. Пійп і эстонскі пасол г. А. Рэй.

Перагаворы закончыліся 28 верасня падпісаннем пакта аб узаемадапамозе і гандлёвага пагаднення. Тэкст пакта аб узаемадапамозе і змест гандлёвага пагаднення прыводзіцца ніжэй.

Пакт аб узаемадапамозе паміж СССР і Эстонскай Рэспублікай

Прэзідыум Вярхоўнага Совета СССР, з аднаго боку, і прэзідэнт Эстонскай Рэспублікі, з другога боку, у мэтах развіцця ўстаноўленых мірным дагаворам ад 2 лютага 1920 г. прыязных адносін, асноўваных на прызнанні незалежнай дзяржаўнасці і неўмешання ва ўнутраныя справы другога боку, прызнаючы, што мірны дагавор ад 2 лютага 1920 года і дагавор аб ненападзенні і мірным вырашэнні канфліктаў ад 4 мая 1932 г. па-ранейшаму з'яўляюцца трывалай асновай іх узаемных адносін і абавязацельстваў, перакананыя, што інтарэсам абодвых дагаварваючыхся бакоў адпавядае заключэнне дасканалых умоў забяспячэння ўзаемнай безапаснасці, прызналі неабходным заключыць паміж сабою наступны пакт аб узаемадапамозе і назначылі для гэтай мэты сваімі упоўнаважанымі:

Прэзідыум Вярхоўнага Совета СССР: В. М. Молатава, старшыню Совета Народных Камісараў і Народнага Камісара Замежных Спраў.

Прэзідэнт Эстонскай Рэспублікі: Карла Селтэра, міністра замежных спраў, гэтыя упоўнаважаныя згадзіліся аб наступным:

Артыкул I.

Абодва Дагаварваючыяся Бакі абавязваюцца аказваць адзін другому ўсялякую дапамогу, у тым ліку і ваенную, у выпадку ўзнікнення прамога нападзення або пагрозы нападзення з боку любой вялікай еўрапейскай дзяржавы ў адносінах марскіх граніц Дагаварваючыхся Бакоў у Балтыйскім моры або сухапутных іх граніц праз тэрыторыю Латвійскай Рэспублікі, а таксама і ўказаных у арт. III.

Артыкул II.

СССР абавязваецца аказваць Эстонскай Арміі дапамогу на ільготных умовах узбраеннем і іншымі ваеннымі матар'яламі.

Артыкул III.

Эстонская Рэспубліка забяспечвае за Совецкім Саюзам права мець на эстонскіх астравах Саарэмаа (Эзэль), Хійумаа (Даго) і ў горадзе Палдысні (Балтыйскі Порт) базы ваенна-марскога флота і некалькі аэрадромаў для авіяцыі, на правах арэнды па ходкай цане. Сталыя месцы для баз і аэрадромаў адводзяцца і іх граніцы вызначаюцца па ўзаемнаму пагадненню.

У мэтах ахраны марскіх баз і аэрадромаў, СССР мае права трымаць у вучастках адведзеных пад базы і аэрадромы на свой кошт строга абмежаную колькасць совецкіх наземных і паветраных узброеных сіл, максімальная колькасць якіх вызначаецца асобным пагадненнем.

Артыкул IV.

Абодва Дагаварваючыяся Бакі абавязваюцца не заключаць якіх небудзь саюзаў або ўдзельнічаць у кааліцыях накіраваных супроць аднаго з Дагаварываючыхся Бакоў.

Артыкул V.

Правядзенне ў жыццё гэтага пакта ні ўякой меры не павінна закранаць суверэных праў. Дагаварваючыхся Бакоў, у прыватнасці сістэмы іх дзяржаўнага ладу. Вучасткі прызначаныя пад базы і аэродромы арт. III астаюцца тэрыторыяй Эстонскай Рэспублікі.

Артыкул VI.

Гэты пакт уступае ў сілу з абменам актаў аб ратыфікацыі. Абмен гэтых актаў будзе утвораны на працягу 6 дзён са дня падпісання гэтага пакта ў горадзе Таліне.

Тэрмін дзеяння гэтага пакта дзесяць гадоў, пры чым, калі адзін з Дагаварваючыхся Бакоў не прызнае неабходным дэнонсіраваць гэты пакт за год да сканчэння тэрміна, апошні аўтаматычна прадаўжае сваё дзеянне на наступныя 5 гадоў.

Артыкул VII.

Гэты Пакт складзены ў двух арыгіналах на рускім і эстонскім языках у горадзе Маскве, 28 верасня 1939 года.

В. Молатаў. К. Селтэр.

28 верасня 1939 г.

Гандлёвае пагадненне прадугледжвае павялічэнне таваразвароту паміж Эстоніяй і СССР у $4^1/_2$ разы і ўстанаўлівае размер агульнага зварота паміж абодвымі дзяржавамі ў 39 мільёнаў эстонскіх крон.

СССР прадастаўляе Эстонскай Рэспубліцы транзыт тавараў па чыгуначных і водных шляхах СССР на Мурманск, Сароку і ў парты Чорнага Мора. Гандлёвае пагадненне прадугледжвае таксама вялікае пашырэнне транзіта совецкіх тавараў праз эстонскія парты.

Жыць стала лепш, стала весялей...

СВЕНЦЯНЫ. Больш дзесяці дзён на тэрыторыі Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны б'е крыніцай свабоднае, радаснае жыццё.

Усюды грымяць бадзёрыя песні пра вялікага Сталіна, пра гераічную доблесную Рабоча-Сялянскую Чырвоную Армію і яе слаўнага палкаводца таварыша Варашылава.

З захапленнем і лікаваннем сустрэлі нашы браты-беларусы і ўкраінцы — доблесную, непераможную Чырвоную Армію, якая вызваліла іх ад нацыянальнага і сацыяльнага гнёту, ад гнёту польскіх паноў і памешчыкаў. Са слязамі радасці кідаюцца працоўныя беларусы і яўрэі Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны ў абдымкі да камандзіраў і чырвонаармейцаў, праяўляюць чулыя клопаты аб Чырвонай Арміі. Сяляне выходзяць насустрэч байцам, апранутыя па-святочнаму і частуюць іх. Яны сустракалі Чырвоную Армію, як армію брацкага, многанацыянальнага совецкага народа, якая дапамагла ім зажыць свабодным, шчаслівым мірным жыццём. З усіх куткоў мы чуем словы:

— Жыць стала лепш, жыць стала весялей.

І сапраўды так. Жыць стала весялей. У горадзе Свенцяны, дзе некалькі дзён назад сяляне гнулі спіну перад панамі і памешчыкамі, зараз яны сталі гаспадарамі зямлі і лясоў.

У кожнай вёсцы Свенцянскага павета арганізаваны сялянскія камітэты, якія праводзяць учот панскіх маёнткаў. Ва многіх валасцях арганізавана ўжо раздача сялянам-батракам і беднякам панскай зямлі. Вялікую дапамогу аказваюць у гэтай рабоце землямеры.

Асабліва добра спраўляецца са сваёй работай Свенцянскі сялянскі камітэт. Ён на працягу 5-6 дзён узяў на учот усе панскія маёнткі, захоўвае ад раскрадання лясы, вядзе барацьбу са спекулянтамі.

Разам з сельска-гаспадарчымі работамі, камітэт праводзіць культурна-масавую работу сярод сялянства. За зусім кароткі час, шэсцьсем дзён, працоўныя сяляне, жыхары горада Свенцяны прагледзелі больш 8 совецкіх драматычных пастановак. Асабліва вялікае уражанне зрабіў на гледачоў чырвонаармейскі ансамбль песні і пляскі. Кожнае выступленне ўдзельнікаў ансамбля песні, або танца выклікала энтузыязм, доўга нясціхаўшыя апладысменты і воклічы: „Вялікаму Сталіну, Ура!

Няхай жыве героічная, доблесная Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія! Няхай жыве першы маршал Совецкага Саюза таварыш Варашылаў!...

Т. Скавародка.

Нападзенне невядомай падводнай лодкі на совецкі параход „Піонер“

ЛЕНІНГРАД, 28 верасня (ТАСС). Па радыёпаведамленню капітана совецкага парахода „Піонер“ 28 верасня, каля 2 гадзін ночы, пры ўваходзе ў Нарвскі заліў ён быў атакован невядомай падводнай лодкай і быў вымушан выкінуцца ў раёне мелі „Вігрунд“.

К месцу аварыі парахода высланы выратавальныя партыі. Каманда парахода не знаходзіцца ў небяспецы.

Радасна жывуць калгаснікі

ЧАВУСЫ, Магілёўскай вобласці (па тэлефону) Калгаснікі раёна з вялікім натхненнем вітаюць гераічныя подвігі непераможнай Чырвонай Арміі, якая выконвае гістарычную місію па вызваленню сваіх братоў Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны. У калгасах адбываюцца мітынгі.

— Мы жадаем, каб і нашы браты жылі так свабодна і радасна, як жывём мы. У адказ на заклік главы Совецкага Ўрада тав. Молатава аб чэснай і самаадданай працы, мы яшчэ шырэй разгорнем соцыялістычнае спаборніцтва, узнімем прадукцыйнасць калгаснай працы, — пішуць калгаснікі сельска-гаспадарчай арцелі „Юны Комунар».

З кожным годам багацее калгас „Юны Комунар". Радасным, заможным і культурным стала жыццё калгаснікаў. У калгасе ёсць аўта-машыны, лесапілка, многа розных складаных сельска-гаспадарчых машын. На аснове соцыялістычнага спаборніцтва ў гэтым годзе калгас дабіўся новых поспехаў. Атрыман багаты ўраджай: яравых сабрана па 13 цэнтнараў з гектара, жыта па 11—12 цэнтнараў. Небывалы ўраджай атрымала звяно З. Ракава. Яно сабрала з гектара 31 цэнтнар ячменю. Паспяхова праведзена ў калгасе сяўба азімых на плошчы 236 гектараў.

Узнімаецца вага калгаснага працадня. Зараз у калгасе ідзе выдача хлеба авансам. Калгаснік Грыгоры Андрэеў на 800 працадзён атрымаў авансам 90 пудоў хлеба. Калгасніку Нікалаю Гараваму належыць атрымаць за выпрацаваныя працадні звыш 2000 кілаграмаў хлеба. Гэта авансам. Пры канчатковым разліку Гаравы атрымае каля 5 тон збожжа і больш 2000 рублёў грашыма.

— Куды ўсё гэта я падзену?— кажа Гаравы, — у мяне яшчэ ёсць запасы хлеба з мінулых гадоў.

Пасля поўнага разліку па дзяржаўных пастаўках, калгаснікі арцелі «Юны Комунар» прадалі дзяржаве 15 тон лішкаў хлеба.

Падрыхтоўка да 50-годзя са дня смерці Н. Г. Чэрнышэўскага

ЯКУЦК, 28 верасня (ТАСС). У рэспубліцы разгортваецца падрыхтоўка да 50-годзя са дня смерці вялікага рускага вучонага і публіцыста-рэволюцыянера Н. Г. Чэрнышэўскага, якая спаўняецца 29 кастрычніка.

Пры Соўнаркоме Якуцкай АССР створана спецыяльная ўрадовая камісія. Бібліятэкі, клубы і парткабінеты Якуцка і Вілюйска, дзе Чэрнышэўскі доўгія годы нахадзіўся ў ссылцы, рыхтуюць выстаўкі, прысвечаныя вялікаму вучонаму, і цыкл лекцый аб яго жыцці і дзейнасці.

Якуцкае абласное выдавецтва выпускае з друку кнігу Струмінскага — „Н. Г. Чэрнышэўскі ў вілюйскай ссылцы“.

Супрацоўнікі паўпрэдства СССР у Варшаве выехалі ў Кенігсберг

Берлін. 27 верасня. (ТАСС.) Вярнуўшыяся з Варшавы замежныя дыпламаты паведамляюць, што 62 супрацоўнікі совецкага пасольства, у тым ліку 22 жанчыны з 23 дзяцьмі апошнія дні аказаліся абкружаны ўзброенымі людзьмі ў вельмі пастрадаўшым будынку совецкага пасольства ў Варшаве і па гэтаму не змаглі сумесна з дыпламатычным замежным корпусам пакінуць горад. Аднак, пры садзеянні вярхоўнага камандвання германскай арміі 26 верасня ў 11 гадзін 62 супрацоўнікі совецкага пасольства перайшлі лінію германскіх пазыцый і затым направіліся ў Кенігсберг.

350 зёран у коласе

У павільёне Украінскай ССР выстаўлен новы стэнд, прысвечаны работам прафесара харкаўскага інстытута механізацыі сельскай гаспадаркі таварыша Супруненко. Шляхам хімічнага уздзейнічання на каласы шлянштэйнскага жыта у перыяд яго цвіцення прафесару Супруненко удалося вывесці новыя віды безастага жыта. Асобныя каласы якога налічваюць у сябе да 350 зеран замест звычайных 60. Вага зеран складае 9 - 10 грам, у чатыры разы больш звычайнага.

5 мільёнаў метраў асенне-зімовых тканей

ІВАНАВА, 27 верасня (ТАСС). Аддзелачная фабрыка Вялікай іванаўскай мануфактуры імені Молатава упершыню начала выпрацоўваць асенне-зімовыя ткані. Да пачатку сезона выпушчана звыш 5 мільёнаў метраў шарсцянкі і стракататканай 18 розных малюнкаў.

З гордасцю буду служыць у Рабочай Гвардыі

Голад, жабрацтва і беспраўе — вось спадарожнік нашага мінулага жыцця. Наша сям'я увесь час жыла у горадзе Вільно. Але гэта было не жыццё, а мучэнне. Прышлося перанясці усе няўзгоды капіталістычкага лада. Бацька мой быў чорнарабочы. І работы яму мала калі удавалася атрымаць. Цяжка яму было пракарміць сям'ю. Ён заўчасна выбіўся з сіл, састарыўся. Утрыманне сям'і прышлося ўзяць на сябе. Але як я мог утрымліваць, калі работу атрымаць было цэлай праблемай. Калі і удавалася дзе-небудзь паступіць, то капіталіст бязмерна эксплаатаваў, выжымаў усе сілы і плаціў за гэта горкія грашы. Такім было наша цяжкае непрыглядное жыццё. Перабіваліся з квасу на хлеб, бадзяліся з угла ў вугал. А капіталісты супакаівалі нас: маліцеся богу і ён вам дапаможа.

Але бог не дапамог. Вызваленне прынесла нам Чырвоная Армія. Няма слоў, каб выразіць усю ўдзячнасць слаўнай Чырвонай Арміі, Савецкаму Ураду і вялікаму правадыру таварышу Сталіну за аказаную дапамогу ў вызваленні нас ад польскага гнёта.

Мы свабодна ўзлыхнулі, загаварылі поўным голасам. Для нас настала новае жыццё, другая моладасць.

Я з вялікай радасцю ўступіў у рады Рабочай Гвардыі, каб захоўваць рэвалюцыйны парадак, ахоўваць дзяржаўную маёмасць.

З гордасцю я нашу чырвоную павязку на руцэ. Не пашкадую аддаць усе сілы, а калі патрэбна і жыццё для выканання ўскладзеных на мяне абавязкаў.

Балін Віктар Іванавіч.
Палітрук адзялення 8 Батальёна Рабочай Гвардыі

—:::—

Не дапусцім ворагаў у Рабочую Гвардыю

Вялікае шчасце для рабочага і селяніна панскай Польшчы было знайсці хоць сезонную работу. Аб сталай рабоце не было чаго і гаварыць. Большасць рабочых гор. Вільно хадзілі цэлымі месяцамі без работы.

За дваццаць год мы перанеслі вялікія пакуты і здзекі.

Чаго толькі не бачыў бедны селянін беларус за гэты час? Не адзін раз ён атрымаў ад польскіх эксплаататараў дзесяткі бізуноў, не адзін з іх быў скалечаны. Становіцца цяжка на сэрцы, калі ўспамінаем пражытыя годы.

Настаў вясёлы, радасны дзень, 19 верасня Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія, якая вызваліла працоўных Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны ад панскага ярма, заняла гор. Вільно.

Жыццё ў горадзе пайшло па-новаму.

З першых дзён я ўступіў ў Рабочую Гвардыю. Быць рабоча-гвардзейцам я лічу за вялікае шчасце.

Я аддам ўсё сваё жыццё за справу Совецкай улады, за правадыра працоўных усяго свету Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна.

Асобныя варожыя элементы пыталіся пралезці ў рады Рабочай Гвардыі, для таго каб знутры шкодзіць рабочай справе. Мы прынялі ўсе меры, каб не дапускаць такія элементы ў рады, якія заклікаены абараняць інтарэсы працоўных.

У радах Рабочай Гвардыі панскім крывапіўцам і іх прыхвоснікам не будзе месца.

А. Карпінскі
Камандзір Рабочай Гвардыі 7 батальёна.

—:::—

Буду служыць працоўнаму народу

24 верасня я паступіў у Рабочую Гвардыю. Быць чырвоным гвардзейцам — вялікая і ганаровая справа.

З першых дзён я стаў добрасумленна выконваць загады камісара гвардыі, змагацца з польскімі афіцэрскімі бандамі, якія яшчэ перашкаджаюць нармальнаму жыццю насельніцтва горада Вільно.

На мяне, як на члена Рабочай Гвардыі, ускладзена вялікая адказнасць — сачыць за парадкам у горадзе. Быць пільным да ворагаў.

Прайшлі цяжкія дні. Настала свабоднае, радаснае жыццё. Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія пазбавіла нас нагайкі польскіх паноў і памешчыкаў.

Я вельмі рад, што разам з байцамі Рабоча-Сялянскай Арміі буду змагацца з польскімі панамі і памешчыкамі.

Хопіць служыць польскаму арлу, перед якім больш дваццаць год гнулі спіны нашы браты і сёстры. Я буду служыць працоўнаму народу, які асвабадзіў мяне і маіх радных ад вечнай кабалы, ад цёмры.

Канец нашым цяжкім дням прышоў. Ад ярма эксплаатацыі нас вызваліў вялікі совецкі народ. Ён працягнуў нам руку дапамогі ў надзвычай цяжкі час.

Вялікае дзякуй за дапамогу нашаму роднаму бацьку таварышу Сталіну.

П. К. Ковалеў
гвардзеец 7 батальёна,

Да ўвагі грамадзян гор. Вільно

Даводзіцца да ведама ўсіх грамадзян гор. Вільно, што з 28 верасня ўсе кінотэатры горада будуць пачынаць работу ад 1 гадзіны дня і канчаць у 7 гадз. 30 мінут вечара.

Цэны на білеты ўстанаўліваюцца ад 50 капеек да 1 рубля 50 капеек.

На экранах дэманструюцца совецкія кінокарціны.

ЗА РУБЯЖОМ

Паведамленне вярхоўнага камандавання германскай арміі аб капітуляцыі Варшавы

БЕРЛІН, 27 верасня (ТАСС). Германскае інфармацыйнае бюро перадало сёння наступнае паведамленне вярхоўнага камандавання германскай арміі: „Варшава здалася без усякіх умоў". Фармальная здача горада вярхоўнаму камандаванню германскай арміі адбудзецца 29 верасня. Ваенны гарнізон Варшавы налічвае, па маючымся даным, звыш 100 тысяч чалавек".

—:::—

Сводка вярхоўнага камандавання германскай арміі

БЕРЛІН. 28 верасня. (ТАСС). Германскае інфармацыйнае бюро перадае паведамленне вярхоўнага камандавання германскай арміі, у якім гаворыцца: ва ўчарашніх баях на паўднёвым флангу на ўсход ад ракі Сан узята ў палон 500 афіцэраў і 6000 салдат. Акрамя 41 дывізіі мы ўзялі ў палон камандуючага арміяй, камандуючага корпусам пагранічнай аховы, а так сама камандзіраў 7 і 39-ай дывізіі разам з іх штабамі. Варшава, якая ўчора капітуліравала безагаворачна, будзе занята 29 верасня. Гарнізон Варшавы налічвае звыш 100 тысяч чалавек. Сёння ў поўдзень камендант Модліна таксама зрабіў заяву аб здачы крэпасьці.

На захадзе сур'ёзных баёў не было. У часе паветранага боя над Саарбрукенам быў збіт адзін самалёт ворага.

Атрад баявой авіяцыі паспяхова атакаваў цяжкі брытанскі крэйсер каля вострава Мэй (ля ўзбярэжжа Шатландыі). Бомба вагой у 250 клгр. папала ў пярэднюю частку карабля.

—:::—

Французскае паведамленне аб ваенных дзеяннях

Парыж, 28 верасня (ТАСС). Агенцтва Гавас перадае па радыё наступнае апублікаванае сёння раніцай афіцыяльнае камюніке аб ваенных дзеяннях:

«Ноч прайшла спакойна на ўсёй лініі фронта. Атака праціўніка к захаду ад Саарбрукена пацярпела няўдачу. На моры аднавілася рэгулярная гандлёвая навігацыя, дзякуючы арганізацыі сістэмы марскога і паветранага канваіравання і патруліравання. Учора пасля поўдня французскі і англійскі марскі флот сумеснымі дзеяннямі збілі некалькі знішчальных самалётаў праціўніка. Адзначалась актыўнасць нашай разведвацельнай авіяцыі на працягу ночы».

Унясенне ваеннага бюджэта на зацверджанне палаты абшчын

ЛОНДАН, 28 верасня. (ТАСС). Агенцтва Рэйтэр паведамляе, што ўчора міністр фінансаў Саймон унёс на разгляд палаты абшчын новы ваенны бюджэт. У сваім выступленні Саймон заявіў, што калі прымаўся бюджэт на гэты год, то яго расходная часць вызначалася ў размеры 1.322 мільёнаў фунтаў стэрлінгаў. Выдаткі на абарону, асыгнованыя ў той час, складалі 630 мільёнаў фунтаў стэрлінгаў. Пры гэтым меркавалася, што расходы па бюджэту будуць пакрыты з бюджэтных паступленняў (ў суме 942 мільёнаў) і шляхам пазык (у суме 380 мільёнаў). Але да таго, як гэты бюджэт быў канчаткава прыняты, расходы на абарону ўзраслі да 730 мільёнаў фунтаў стэрлінгаў і тым самым павялічылася да 480 мільёнаў фунтаў стэрлінгаў тая часць выдаткаў па бюджэту, якая павінна быць пакрыта шляхам пазык. Перад роспускам палаты на летнія канікулы агульная выдаткова расходная часць бюджэта была павелічана да 1.458 мільёнаў фунтаў стэрлінгаў. Нягледзячы на гіганцкія цыфры гэтага бюджэта ён будаваўся, выходзячы з таго, што Англія не ўступіць у вайну на працягу гэтага года.

Пасля абвяшчэння вайны Германіі 3-га верасня парламент неадкладна далаткова асыгнаваў 500 мільёнаў фунтаў стэрлінгаў. Саймон заявіў, што ён ня можа гарантаваць, што гэтых дадатковых 500 мільёнаў фунтаў стэрлінгаў хопіць на пакрыццё ўсіх выдаткаў да канца бягучага фінансавага года (31 сакавіка 1940 года). „Мы павінны выходзіць з таго, што прыдзецца выдаткаваць у бягучым фінансавым годзе амаль 2 мільярды фунтаў стэрлінгаў",— Саймон заклікаў усё насельніцтва краіны ўстрымлівацца ад лішніх капітальных укладанняў і зрабіць збераженні дзеля таго, каб улажыць іх у новыя пазыкі прызначаныя для вядзення вайны.

Саймон далей заявіў, што Урад намечае павелічэнне палаходнага падатка з $5^1/_2$ шылінга да $7^1/_2$ шылінга на 1 фунт стэрлінгаў даходу.

Павышаецца падатак на спадчыну. Павялічваюцца ўскосныя падаткі. У прыватнасці павялічваецца падатак на піва, гарэлку, табаку, цукер, імпартныя тавары, пры чым на ўсе алкагольныя вырабы падатак павялічваецца з заўтрашняга дня. Уводзіцца падатак на звышпрыбытак, які павінен скласьці 60% той часці прыбытку, якая перавышае размеры даваеннага часу. У рэзультаце павышэння падаткаў, даходы ў застаўшыяся месяцы гэтага года павінны ўзрасці на 107 мільёнаў фунтаў стэрлінгаў. У працягу ўсяго года даходы ўзрастуць на 226,5 мільёнаў фунтаў стэрлінгаў.

—:::—

Інтэрніраванне польскага самалёта ў Літве

КАЎНАС, 28 верасня (ТАСС). Літоўскае тэлеграфнае агенцтва паведамляе, што польскі ваенны самалёт прызямліўся 27 верасня ў Каўнасе. Усе чатыры члены экіпажа, у тым ліку адзін палкоўнік, інтэрніраваны літоўскімі ваеннымі ўладамі. Самалёт канфіскован.

Колькасць польскіх ваенных інтэрніраваных у Літве не перавышае 10 тысяч чалавек.

Інтэрніраваныя польскія афіцэры і салдаты ўтрымоўваюцца ў канцэтрацыённых лагерах.

—:::—

Рэпрэсіі супроць камуністычнай партыі Францыі

НЬЮ-ЁРК, 28 верасня (ТАСС). Як паведамляе агенцтва „Юнайтэд Прэс" з Парыжа, французская паліцыя правяла налёты на памяшчэнні цэнтральнага камітэта французскай компартыі, а таксама на памяшчэнні многіх мясцовых камітэтаў. Усе гэтыя памяшканні апячатаны. Праведзены так-жа паліцэйскія налёты на памяшканні цэлага шэрагу грамадзкіх арганізацый, прымыкаўшых да народнага фронта.

Далей агенцтва паведамляе, што месцапрабыванне кіраўнікоў комуністычнай партыі невядома. Консэрватыўныя партыі маюць намер унясці прапанову аб скліканні парламента для разгляду пытання аб пазбаўленні мандатаў 76 камуністычных дэпутатаў і 2 сенатараў.

—:::—

Таварны голад у Японіі

ТОКІО. 28 верасня. (ТАСС). Рэзкае скарачэнне вытворчасці тэкстыльных тавараў для ўнутранага спажывання і адсутнасць на рынку прадметаў першай неабходнасці адчуваецца ў Японіі з кожным днём усё больш. Асабліва гэта у гэтым годзе. Японскі ўрад забараніў вытворчасць многіх тавараў, якія ідуць на задавальненне патрэб насельніцтва.

Вырабы бавоўны, розныя матар'ялы, скура, розныя сарты дзерава і другая сыравіна ідзе на патрэбы ваеннай прамысловасці.

Японскі ўрад імкнучыся як небудзь дапоўніць недастаючыя матар'ялы на рынку, пускае ў ход замяніцелі.

Як паведамляе газета „Хоці', міністэрства гандлю і прамысловасці Японіі рашыла скарыстаць для вытворчасці тэкстыльных тавараў розныя адыходы: анучы, ачоскі бавоўны, кускі старога шоўка і інш.

Для гэтага арганізуецца спецыяльная кампанія. Вядома, што выробы з такіх адыходаў пасля першай жа сціркі рвуцца, скарачаюцца ў аб'ёме і робяцца не прыгоднымі для носкі.

Баявыя эпізоды

I. Чацьвера смелых

ЗАХОДНЯЯ УКРАІНА, 28 верасня (ТАСС).

Іх было чацьвера — мужныя і смелыя сыны соцыялістычнай радзімы — камандір кулямёта таварыш Ярцэў, наводчык таварыш Сафоноў, таварыш Бабёр і кіруючы гэтай невялічкай групай лейтэнант таварыш Лубкоўскі. Яны атрымалі заданне: пайсці ў разведку і прынесці точныя даныя аб распалажэнні ворага.

Спаткаўшыся з атрадам праціўніка, яўна перавышаўшага па ліку групу разведчыкаў, лейтэнант таварыш Лубкоўскі прыняў рашэнне ўступіць у бой. Чацьвёра— супроць 70 польскіх салдат і афіцэраў, узброеных вінтоўкамі і кулямётамі. Завязаўся бой. Здэмаралізаваны вораг здаўся адважнай чацьвёрцы.

Разам з палоннымі было захоплена 200 вінтовак, 8 тысяч патронаў, 2 ручныя кулямёты, 1 станкавы, радыё-станцыя і гармата.

II. Банда знішчана

Разведка данясла, што ў сяле распаложаным недалёка ад маршрута руху Н-скай часці, аперыруе узброеная банда польскіх афіцераў і салдат у ліку 122 чалавек. Чакаючы самалётаў, якія абяцалі прыслаць польскія генералы, банда грабіла насяленне, пагражаючы спаліць украінскае сяло.

Камандзір часці паставіў перад узводам малодшага лейтэнанта тав. Вінакура заданне:—ліквідаваць банду. Праз 10 мінут узвод дайшоў да месца распалажэння праціўніка. На прапанову здацца банда адказала агнём. Узвод пачаў акружаць ворага.

— Здавайцеся, — ізноў запрапанаваў таварыш Вінакур.

У адказ агонь павялічыўся. Тады ўзвод пашоў у атаку і меткім варашылаўскім агнём заставіў праціўніка здацца. Узвод выканаў сваё заданне. У палон узяты тры высшых чыны і 32 афіцэры. Радавыя салдаты былі абязброены і адпушчаны дамоў. Пры абязброіванні адабрана многа вінтовак, некалькі тысяч патронаў, рознае снаражэнне і 2 зянітныя кулямёты.

III. Адвага байца

Н—ская часць выконваючы баявое заданне пакінула горад. Коннікі імчаліся ў разведку. Праз некаторы час камандаванне атрымала першае данясенне.

—На скраю леса—канцэнтрацыя буйных сіл праціўніка з абозамі. Уступаюць у бой.

Начную цішыню нарушыла кулямётная страляніна. Праціўнік упарта супраціўляўся, але мужныя разведчыкі праліўным дажджом свінца зрэзалі ворага. Калі падышлі нашы перадавыя часці, вораг быў ужо знішчаны.

У часе боя польскія абозы скрыліся ў лесе. З імі сустрэўся чырвонаармеец Дмітрый Дух.

Накіроўваючыся ў сваю часць, ён пачуў топат капытоў. Чырвонаармеец залёг у кустах і прыгатаваўся да бою. Хутка паказаўся абоз праціўніка.

— Ні з месца — голасна закрычаў тав. Дух. — Рукі ўверх! Свое словы чырвонаармеец пацвярдзіў выстраламі. Спалоханыя палякі здаліся.

— Прапаную здаць аружжа.

Палякі — іх аказалася 8 чалавек — паспешна выканалі прыказ чырвонаармейца.

— Неахвотна ехалі палонныя, расказваў пасля тав. Дух. Яны паміж сабой аб нечым гаварылі, відаць, прыгатаўляліся да пабегу. Але я іх добра пільнаваў. Палонных таварыш Дух даставіў у штаб.

Адказны рэдактар І. М. ОФЕНГЕЙМ.

Паведамленне

30 верасня ў 4 гадзіны па мясцоваму часу ў памешканні гарадскога тэатра склікаецца сход рабочых троек, выбраных на агульных сходах прадпрыемстваў і ўстаноў у дапамогу Часоваму Упраўленню гор. Вільно.

Часовае Упраўленне гор. Вільно

Яўрэйскі Навуковы Інстытут гэтым паведамляе, што ад 1 кастрычніка чытальня Яўрэйскага Навуковага Інстытута (Вівульскага 18) будзе адкрыта штодня ад 15 да 19 гадзін па мясцоваму часу.

30 верасня ў 8 гадзін раніцы ў кіно „Муза" адбудзецца агульны сход загатоўшчыкаў і шаўцоў горада Вільна.

Саюз гарбароў г. Вільно.

Адрэс рэдакцыі і друкарні вул. Епіскопа Бандурскага 4. Тэл. 79 і 99.